Работу я пачаў над вобразам незалежна ад п'есы і задоўга да рэпетыцый спектакля. Многа гадзін я правёў у залах музея Леніна ў Маскве і Ленінградзе, уважліва вывучаў з натуры рысункі Бродскага, Альтмана, Андрэева, не раз праглядаў дакументальныя фільмы аб Леніне, фотаздымкі, не раз слухаў пласцінкі з запісам прамоў Уладзіміра Ільіча, прабуючы пераняць яго паходку, яго манеру гаварыць. Кнігі Ем. Яраслаўскага аб Леніне, кнігі Крупскай, Анры Барбюса, апавяданні рабочых, наведванні шалаша Леніна ў Разліве — усё гэта дапамагала мне ў маёй рабоце. Я таксама пабываў у Смольным, сустракаўся з радам людзей, якія былі знаёмы з Леніным у 1917—1918 годзе. Мяне ўсхвалявалі асабліва цёплыя адносіны, з якімі гэтыя таварышы гаварылі аб сваіх сустрэчах з Ільічом. К канцу маёй работы над вобразам я сустрэўся з таварышам Ем. Яраслаўскім. Гэтая сустрэча дапамагла мне асмысліць усю маю работу над вобразам і ўмацавала надзею ў маіх прадстаўленнях аб вобразе Ільіча.

Важна было не захапіцца толькі знешнім перайманнем. Важна было ўскрыць унутраную сутнасць вобраза і арганічна спалучыць унутраныя і знешнія рысы.

Работа над вобразам Леніна прынесла мне многа творчай радасці. Гэта работа ўзбагаціла мяне, а ўвесь спектакль калектыў тэатра падняў на вялікую ідэйна-мастацкую вышыню.

Ужо больш 100 разоў я выступаў перад гледачом у ролі Уладзіміра Ільіча. Але кожны раз прыносіць новае хваляванне, кожны раз адчуваеш вялікую адказнасць. Асаблівую адказнасць я адчуваю ў гэтыя дні, калі я рыхтуюся паказаць гледачу Беластока вобраз вялікага генія чалавецтва — Уладзіміра Ільіча Леніна. Гэтай сустрэчы з новым гледачом я даўно чакаю.

Засл. арт. БССР
П. Малчанаў.

КЛОПАТЫ ПАРТЫІ І ЎРАДА

З вялікім хваляваннем і радасцю чакае ўвесь калектыў другога Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра сустрэчы з сваім новым гледачом, з сваімі адзінакроўнымі роднымі братамі. Кожны з нас не раз думаў аб сваіх братах, якія жылі па той бок мяжы, і не раз хацелася пагаварыць з імі.

І вось дзякуючы мудрай палітыцы нашай партыі, дзякуючы гераічнай Чырвонай Арміі нашы мары здзейсніліся.

Скора са сцэны Беластоцкага гарадскога тэатра мы раскажам аб нашым гераічным народзе, мы раскажам аб нашым цудоўным і радасным жыцці мовай сцэнічных мастацкіх вобразаў. І я ўпэўнен, што мы зразумеем адзін аднаго, бо ў нас адны ідэі, бо ў нас адны думкі, бо ў нас адны імкненні, адна і тая-ж гарачая любоў да сваёй радзімы, да сваёй партыі, да свайго ўрада, якія нас выхавалі і вывелі на шырокі шлях творчага жыцця Юнакамі нас — сыноў і дачок беларускага народа — сабралі з вёсак, мястэчак і гарадоў і паслалі ў сталіцу Совецкага Саюза — Маскву, дзе арганізавалі студыю для беларускага тэатра. У Маскв нас вучылі лепшыя майстры рускага тэатральнага мастацтва, вучні геніяльнага Станіслаўскага. Пасля сканчэння студыі з нас быў арганізаван другі Беларускі Дзяржаўны тэатр.

Не раз ворагі народа імкнуліся перашкодзіць нашаму росту, але заўсёды партыя і ўрад дапамагалі нам у нашым ідэйна-творчым росце.

І дзякуючы штодзённым клопатам аб нас партыі і ўрада наш тэатр атрымаў рад творчых перамог і з'яўляецца адным з вядучых калектываў нашай ордэнаноснай рэспублікі. Гэтыя клопаты мы адчуваем кожны час, і яны ствараюць усе ўмовы для далейшага творчага росту ўсяго тэатра і кожнага актора паасобку.

Засл. арт. БССР
Ц. Сяргейчык.

СУСТРЭЧА З НОВЫМ ГЛЕДАЧОМ

Другі Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр прыязджае ў гор. Беласток у гістарычныя дні для народаў заходніх абласцей БССР, калі пачынаецца выбарчая кампанія ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР — вялікае свята народа, і мы — калектыў беларускага тэатра, — прымем удзел у гэтым свяце, мы раскажам народу аб вялікай Канстытуцыі перамогшага соцыялізма. Мы раскажам аб мудрасці ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Мы раскажам аб вялікім Сталіне, які нястомна клапоціцца аб народзе. Мы раскажам аб нашай непераможнай, гераічнай Чырвонай Арміі. Мы панясем большэвіцкае слова ў масы — слова, поўнае любві да партыі, да радзімы, да Сталіна.

Другая наша бліжэйшая задача — моцна звязацца з нашай роднай Чырвонай Арміяй, каб працягнуць і замацаваць тую традыцыйную творчую дружбу, якая існуе паміж ёю і работнікамі мастацтва. Гэта ў першую чаргу павінна будзе выявіцца ў мастацкім абслугоўванні часцей у дні слаўнай XXII гадавіны РСЧА ў ўзяцці творчага шэфства над чырвонаармейскай самадзейнасцю. Наш тэатр мае ў гэтай рабоце вялікі вопыт, і мы поўнасцю яго выкарыстаем у новых умовах.

Гэтую работу — удзел у выбарчай кампаніі і шэфства над Чырвонай Арміяй — мы будзем спалучаць з вялікай творчай работай па падрыхтоўцы новых спектакляў, па паказу нашага рэпертуара беластоцкаму гледачу.

Шмат хвалючага, новага ўбачыць гледач у нашых п'есах. Ідэйна-мастацкі рост нашай совецкай драматургіі ўзбагаціў нашы тэатры новымі поўнацэннымі вобразамі, работа над раскрыццём якіх прыносіць актору творчую радасць, як і работа над вобразамі класічных п'ес.

Такіх вобразаў у маім рэпертуары шмат: легендарны коласаўскі дзед Талаш з п'есы „У пушчах Палесся", Харкевіч з п'есы „Пагібель воўка", камісар з п'есы „Гібель эскадры", Швандзя з п'есы „Любоў Яравая", Ахаў з п'есы „Не ўсё кату масленіца", кравец Гурэвіч з п'есы „Вочная стаўка".

Асаблівае месца ў маёй творчай рабоце займае вобраз вялікага Сталіна. Каб перадаць хоць некаторыя рысы Іосіфа Вісарыёнавіча трэба працаваць цэлыя годы. Да таго-ж у п'есе „Чалавек з ружжом" драматург даў скупы матэрыял. Я з хваляваннем чакаю таго дня, калі паявіцца новая п'еса, дзе вобраз любімага правадыра і бацькі народаў будзе паказан ва ўсёй велічы.

З пачуццём глыбокай адказнасці рыхтуюся я, як і ўсе мае таварышы, да сустрэчы з нашым новым гледачом.

Народны артыст БССР
А. Ільінскі



«ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ»
Заслужаны артыст БССР Ц. СЯРГЯЙЧЫК у ролі камісара і заслужаны артыст БССР Н. ЗВЕЗДАЧОТАЎ у ролі Івана Шадрына.

П'ЕСЫ І РОЛІ

Пятнаццаць п'ес пакажа другі Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр беластоцкаму гледачу. У гэтым рэпертуары лепшыя спектаклі тэатра, яго творчыя дасягненні. У гэтым рэпертуары п'есы, у якіх паказаны вобразы геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна („Чалавек з ружжом") і аднаго з іх бліжэйшых саратнікаў — Серго Орджанікідзе („Над Бярозай - ракой").

У рэпертуары тэатра 5 арыгінальных п'ес, якія напісаны народнымі паэтамі БССР Якубам Коласам, Янкай Купалай і пісьменнікамі Э. Самуйлёнкам і Пятро Глебка і рад класічных совецкіх п'ес, як, напрыклад, „Любоў Яравая" К. Трэнёва, „Гібель эскадры" А. Карнейчука. Руская класіка прадстаўлена ў тэатры п'есамі вялікіх рускіх пісьменнікаў М. Горкага („Мяшчане") і А. Остроўскага („Не ўсё кату масленіца").

Першым спектаклем мы пакажам беластоцкаму гледачу „Чалавек з ружжом". У гэтай п'есе я выконваю ролю чалавека з ружжом — Івана Шадрына.

Іван Шадрын—гэта збіральны вобраз рускага селяніна часоў імперыялістычнай вайны. Тры годы сядзіць Іван у акопах, абараняючы чужую ўласнасць і пакутліва шукаючы выхаду ў сусветнай бойні. Але вось у яго адпускны білет. Ён едзе ў сваю вёску, да свайго маленькага кавалачка зямлі. Па дарозе дамоў Шадрын заязджае ў Петраград. Вадаварот рэволюцыі захватвае яго. Ён сустракае рабочага Чыбісава і разам з ім пападае ў Смольны, у штаб рэволюцыі.

У Смольным прачытаў дэкрэт аб зямлі, і ўсе сумненні Івана знікаюць. У карыдоры Смольнага ён сустракаецца выпадкова з Леніным. Ленін цёпла і душэўна распытвае Шадрына аб салдацкім жыцці. Калі ён пасля размовы даведваецца, што яго просты, ветлівы субяседнік і ёсць вялікі Ленін, ён ніяк не можа прысці ў сябе ад узбуджэння. Пасля гэтай сустрэчы Шадрын вырас на цэлую галаву, многае стала ясным з таго, што да гэтага часу смутна брадзіла ў яго душы. Ён зразумеў, што трэба абараняць рэволюцыю ад паноў і памешчыкаў.

Рэволюцыя ставіць яго—простага салдата — на чале рэволюцыйнага палка. Я паставіў у ролі Шадрына асноўную задачу—паўней раскрыць веліч Ленінскага генія, сілу яго мыслі, праўду яго ідэі.

Наколькі я справіўся з гэтай работай, скажа беластоцкі гледач, якому я пакажу рад сваіх вобразаў і галоўным чынам вобраз бліжэйшага саратніка Вялікага Сталіна — Серго Орджонікідзе, над якім я цяпер працую.

Засл. арт. БССР
Н. Звездачотаў.



«ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ»
У ролі В. І. Леніна — заслужаны артыст БССР П. МАЛЧАНАЎ, у ролі Івана Шадрына — заслужаны артыст БССР Н. ЗВЕЗДАЧОТАЎ.

Тэатр мастацкай праўды

У цеснай сям'і народаў Вялікага Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам любімай партыі большэвікоў, пры дапамозе свайго старэйшага брата — вялікага рускага народа, — будуе сваё радаснае, шчаслівае жыццё свабодны беларускі народ. Вякамі паднявольны і бяспраўны, ён цяпер дабіўся грандыёзных поспехаў на ўсіх франтах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Квітнее мастацтва Совецкай Беларусі. Створаны беларускія оперы, беларускі балет. Выраслі і ідуць па далейшаму шляху ідэйна-мастацкага росту беларускія драматычныя тэатры.

Сярод гэтых тэатраў знаходзіцца БДТ-2, які быў арганізаван у 1926 годзе з беларускай студыі ў Маскве, якой кіравалі рэжысёры МХАТ—вучні Станіслаўскага. За 13 год свайго існавання тэатр прайшоў шлях ідэйна-мастацкага росту, шлях барацьбы за ідэйна-глыбокі, праўдзівы, рэалістычны спектакль, за спектакль, напоўнены праўдай жыцця.

Ворагі народа на розных этапах жыцця тэатра прабавалі звесці тэатр з правільнага шляху, звярнуць яго ў бок ад стварэння праўдзівых рэалістычных спектакляў да сімвалічнай ідэалізацыі гістарычнага мінулага Беларусі, да замыкання ў шавіністычныя рамкі самабытнасці. Вораг, разгромлены на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва, быў выкрыт і выгнан з тэатра.

У 1927 годзе пры дапамозе грамадскасці тэатр уключае ў свой рэпертуар рэволюцыйную п'есу Лаўрэнёва «Разлом». Поспех «Разлома» вызначыў далейшы шлях тэатра, які пачаў уключаць у свой рэпертуар п'есы на тэмы багатыя справамі і людзьмі нашага соцыялістычнага жыцця.

Пастаўленая тэатрам п'еса Рамашова «Байцы» была пачаткам прадуманай, паслядоўнай упорнай работы тэатра над рэалістычным раскрыццём вобразаў, над глыбокім выражэннем ідэй.

Спектаклем «Гібель эскадры» Карнейчука тэатр замацаваў свой вопыт работы над рэалістычным раскрыццём вобразаў. Гераічнае прыўзнятае гучанне спектакля надала яму рамантычную ўсхваляванасць. Радам чарговых спектакляў тэатр развіў вопыт сваіх першых работ. Гэтыя спектаклі сведчылі аб тым, што тэатр цвёрда становіцца на шлях рэалізма, на шлях стварэння спектакляў глыбокай мастацкай праўды.

Такімі спектаклямі з'явіліся: «Мяшчане» М. Горкага, «Вайна», «У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Вадэвілі» Я. Купалы, «Дзеці Ванюшына» Найдзенава і інш.

Тэатр уключыў у свой рэпертуар п'есу Н. Пагодзіна «Чалавек з ружжом», у якім аўтарам вобразна раскрыт геніяльны ленінскі тэзіс аб ператварэнні вайны імперыялістычнай у грамадзянскую, паказаўшы ролю партыі, яе геніяльных правадыроў у гэтай гістарычнай задачы.

У рабоце над гэтымі спектаклямі ярка развіліся дараванні актораў тэатра. Заслужаны артыст рэспублікі А. Ільінскі атрымаў званне народнага артыста, артысты П. Малчанаў, Ц. Сяргейчык, Н. Звездачотаў — званне заслужаных артыстаў.

Вельмі значна выраслі акторы П. Іваноў, А. Шэлег, С. Скальскі, З. Вялікі, І. Матусевіч, Л. Мазалеўская, Н. Глебоўская, М. Белінская, Е. Лагоўская, Е. Радзялоўская, М. Стройская, Л. Гепнер, Т. Бандарчык, маладыя акторы А. Трусс, Н. Фадзееў, Т. Заранок і інш.

Радам наступных спектакляў: «Павел Грэкаў», «Не ўсё кату масленіца», «Пагібель воўка», — тэатр працягваў свой творчы рост, акружаны клопатамі і ўвагай партыі і ўрада і дапамогай рускага тэатра, выдатныя рэжысёры якога, як, напрыклад, народны артыст СССР прафесар Л. Леанідаў, заслужаны артыст РСФСР А. Зубаў і іншыя, дапамагалі кансультацыяй ў радзе пастановак тэатра і самі працавалі над некаторымі спектаклямі ў нашым тэатры.

Цяпер у атмасферы творчага ўздыму тэатр працуе, не пакладаючы рук, каб дабіцца новых творчых дасягненняў. Работа ідзе над п'есай паэта-ордэнаносца П. Глебка «Над Бярозай-ракой», прэм'ера якой адбудзецца ў канцы гэтага месяца ў Беластоку.

«Над Бярозай-ракой» — хвалюючая паэма аб беларускім народзе, аб Чырвонай Арміі, аб большэвіцкай партыі, аб тым, як пад кіраўніцтвам партыі армія і народ разграмілі ворагаў, вызвалілі беларускую зямлю ад варожага нашэсця.

Праз усю п'есу праходзіць вобраз бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна—Серго Орджанікідзе, якога таварыш Сталін паслаў, каб дапамагчы беларускаму народу ў дні яго напружанай і гераічнай барацьбы з ворагамі, пасягнуўшымі на яго незалежнасць, на яго свабоду.

Пасля выпуску прэм'еры «Над Бярозай-ракой» тэатр возьмецца за новую п'есу Н. Пагодзіна «Крэмлёўскія куранты», у якой выведзены вобразы Леніна, Сталіна, Дзержынскага.

Зараз над п'есамі для тэатра працуюць: народны паэт рэспублікі Якуб Колас, З. Бядуля, К. Чорны, В. Вольскі. Творчая сувязь з імі—адна з асноўных задач тэатра.

Гастролі тэатра ў Беластоку з'яўляюцца для тэатра фактам вялікага значэння. Гэтыя гастролі ён разглядае, як творчы рапарт перад працоўнымі роднай Заходняй Беларусі, назаўсёды вызваленай ад прыгнёту польскіх паноў.

Тэатр у часе работы ў Беластоку будзе наладжваць сувязь са сваім гледачом у творчым кантакце з пісьменнікамі, кампазітарамі, мастакамі і акторамі Беластока. Гэта будзе спрыяць далейшаму творчаму росту тэатра, перад якім наперадзе стаяць вялікія адказныя задачы па падрыхтоўцы спектакляў для паездкі ў Маскву.

Калектыў тэатра ўпэўнен, што ён з гэтай работай справіцца. Залогам гэтага з'яўляецца яго паслядоўны рост, творчая дапамога лепшых майстраў рускага тэатра, рост нашай драматургіі і галоўнае — вялікія клопаты партыі, урада і народа аб мастацтве, якія тэатр адчувае кожны дзень, кожную мінуту.

І. Дорскі.

ВЕЧЕР ВОСПОМИНАНИЙ В ПАРИЖЕ

В замке старого французского города Анжера царило волнение. Правительство «польского государства» готовилось к сессии национального совета, на которой ему предстояло отчитаться в своей деятельности за истекший период. Этот период начинается с того момента, как несколько варшавских «деятелей» перебежали румынскую границу и об'явили себя наследниками золотого запаса, вывезенного на броневиках из Варшавы.

Анжерский замок, то-бишь Речь Посполита Польска, если верить словоохотливым парижским газетам, насчитывает тридцать шесть комнат. Две трети из них заняты под частные апартаменты некоторых министров. «Президент» Рачкевич, «премьер» Сикорский, «министр иностранных дел» Залесский наняли лучшие виллы города. Опять же понаехали дипломаты различных стран, выполняющие те или иные роли в анжерском фарсе, в том числе британский посол, французский посол, папский нунций и посланник Уругвая. Они прочно заняли местные гостиницы. Собственно территория Польши состоит, таким образом, из двенадцати комнат, достаточно плохо отапливаемых.

Согласно конституции анжерско-польского государства, утвержденной, как шутят в Париже, префектурой департамента Мена и Луары, национальный совет состоит из неопределенного количества персон — от девяти до сорока в зависимости от ситуации. В настоящий момент удалось наскрести, по утверждению «Эко де Пари», шестнадцать человек. Компания небольшая, но достаточно почтенная. И вот в Анжере возник вопрос — где и как разместить прибывающих панов-депутатов, чтобы не превращать окончательно в ночлежку остаток территории великодержавной Польши. Приедет этакий парламентарий, поселится, скажем, в «варшавском воеводстве» (третья дверь по коридору налево) и останется там на месяц, на год, навсегда. Поди выстели такого жильца.

Долго совещались Рачкевич с Сикорским и решили провернуть сессию в Париже.

К великому неудовольствию анжерских девиц, дочерей местных торговцев пенькой, уксусом и горчицей, город лишался главного аттракциона.

Итак, сессия национального совета Речи Посполитой открылась в Париже, в здании польского посольства— так именуется на официальном французском языке дом, где группка бывших людей бывшего государства ведет шпионскую и диверсионную работу по заданиям франко-британской разведки.

Все было почти как в Варшаве. Два ряда кожаных кресел с высокими готическими спинками. Походный алтарь. Проповедь, произнесенная епископом Гавлиной, тем самым, что услаждал уши Мосьцицкого, Рыдз-Смиглы и Бека. Увы, на этот раз проповеди не внимали ни тот, ни другой, ни третий. Не было вовсе пилсудчиков на сессии национального совета. Эндеки, представляющие польское государство в приемной господина Даладье, расквитались за все прошлые обиды. В свое время пилсудчики прогнали их от казенного пирога, выжили с теплых, насиженных местечек. Теперь у ящиков с золотым запасом сидят, цепко взявшись за руки, одни лишь эндеки. Только им одним доверено блюсти престиж польского государства в Анжере.

Епископ Гавлина исторгал лирико-патетические рулады. В зале царила строгая и торжественная тишина. «Воспоминания славного прошлого реяли над этими людьми со склоненными головами», — рассказывает умиленный репортер «Пари суар». Мы не знаем, о чем именно думали, склонив головы, господа анжерские министры. Но если уж вспоминать о самом славном, так, вероятно, президент Рачкевич воскресил в памяти ясный весенний день 1922 года. Он тогда был виленским воеводой и ехал в машине в сопровождении пышной свиты из города в свое имение. На лесной опушке дожидалась толпа крестьян. «Опять просители»—поморщился воевода. Но это не были просители. Машина поравнялась с крестьянами, в полицейских полетели камни, охрана разбежалась. Воевода лежал связанный на земле. С него стаскивали штаны. «Будешь мучить народ непосильными налогами?! Будешь лихоимствовать?!»

В варшавских салонах со смехом рассказывали о том, как крестьяне высекли виленского воеводу чуть ли не у самых ворот его имения... Пан президент вздрагивает и начинает ерзать в своем готическом кресле.

У премьера Сикорского самые славные воспоминания относятся ко временам еще не столь далеким. Дело было в Белостоке, в гостинице «Риц». Трое суток шла дикая оргия с участием офицеров местного гарнизона. На третьи сутки перепившиеся до чортиков офицеры выбежали с обнаженными шашками на главную улицу и стали гоняться за прохожими. Счет, пред'явленный генералу владельцем «Рица», составил 30 тысяч злотых. Он остался непогашенным. Не заплатит ли генерал сейчас из золотого запаса?

Епископ кончил проповедь. «От прошлого все перешли к настоящему» — продолжает неугомонный репортер. Алтарь был вынесен, вместо него служители притащили нечто в роде школьной кафедры. Пан Сикорский взобрался на трибуну и начал отчетный доклад. Репортер из вполне понятных соображений очень скупо говорит о практической работе анжерского правительства. С одной стороны, коммерческая тайна. С другой, при подробном перечислении подвигов Рачкевича — Сикорского может притти в неуместно веселое настроение даже неискушенный французский обыватель.

Ну, как не притти в веселое настроение, читая о том, как польский адмирал производит в Лондоне смотр подводной лодки, удравшей в сентябре из Гдыни. Или о том, как Сикорский разрабатывает вопрос о реформе польской спичечной монополии. Или о том, как он назначает воевод и полицмейстеров в Варшаву, Познань, Люблин и Львов. Или о том, как он раздает кресты, звезды и ленты иностранным дипломатам. Или, наконец, о том, как он глубокомысленно рассуждает о «возможности помощи финской армии силами польского легиона».

Деловая часть сессии была недолгой. Вкратце обрисовав положение в Анжере, Сикорский уступил место 80-летнему пианисту Игнатию Падеревскому. Со старца, как говорится, взятки гладки. Полчаса лепетал Падеревский о том, что он твердо верит в победу союзников. А союзники, дескать, не обидят участников сессии и помогут им восстановить «Польшу Болеслава Храброго, Польшу Ягеллонов, Польшу от моря до моря». Под конец его уже не слушали, и секретарь бережно, как музейную редкость, доставил Падеревского на место.

Рачкевич говорил, по выражению «Пари суар», с «нервным под'емом». Трудно, конечно, отделаться даже в такой ответственный момент от виленских воспоминаний. Тем не менее, он не забыл об'явить во всеуслышание (для протокола и для истории), что во всех бедах, постигших Польшу, виноваты-де правительства, пришедшие после «майского переворота» Пилсудского. Что же касается его, Рачкевича, то он обязательно — пусть в этом не сомневаются — спасет Польшу.

На этом сессию об'явили закрытой. Был еще дан банкет, на котором Падеревский в патриотическом экстазе поклялся, что не прикоснется к клавишам до тех пор, покуда над Вислой не расправит крылья белый орел. Сикорский требовал от собутыльников самоотверженности и жертвенности. Министры и сенаторы аплодировали премьеру.

Правительство вернулось в Анжер. Дочери торговцев горчицей и уксусом обрели спокойствие: город их снова стал столицей.

На этом, собственно говоря, можно и закончить рассказ об итогах сессии национального совета найяснейшей Речи Посполитой Польской. Впрочем следует упомянуть еще об одном побочном, если так можно выразиться, обстоятельстве: импрессарио Игнатия Падеревского, прочтя газетный отчет о клятве, данной на банкете, сказал своему секретарю:

— Вычеркните этого пианиста из наших списков. Старик никогда не вернется к роялю.

Б. БЕЛОГОРСКИЙ.
(«Известия»)

РЕЧЬ МИНИСТРА ИНОСТРАННЫХ ДЕЛ ЛАТВИИ Г. МУНТЕРСА

Рига, 13 февраля. Вчера вечером в латвийском университете с докладом о международном положении выступил министр иностранных дел Латвии г. Мунтерс. «Четыре месяца прошло со дня подписания пакта о взаимопомощи с Советским Союзом, — сказал Мунтерс. — Срок вполне достаточный, чтобы подвести некоторые итоги того, как пакт реализуется. Следует отметить, что обе стороны подошли к реализации пакта в духе дружбы и взаимного доверия. Можно выразить уверенность в том, что и впредь нам удастся находить общий язык.

Мы внимательно следили за комментариями иностранной печати о пакте 5 октября, и я не могу сказать, что они во всяком случае первое время нас удовлетворяли. Многое здесь следует об'яснить незнанием обстоятельств, но еще больше— пропагандой с известными целями. В последнее время оценка иностранной печати получила уже другой оттенок, так как всем видно, в какой атмосфере развиваются латвийско-советские отношения. Касаясь двух главных утверждений, которые время от времени повторяются в иностранных газетах, я хотел бы спросить, где же та «советизация», от которой нас предостерегали? и есть ли вообще какой-нибудь житель Латвии, который мог бы сказать, что Советский Союз каким-либо образом вмешивается в наши внутренние дела. В иностранной прессе Латвию называют «протекторатом, потерявшим независимость». Факты, которые все видят, без излишних слов показывают необоснованность такого утверждения. Если указать на успешные экономические и другие переговоры, которые в последнее время велись между обоими правительствами и уже дали конкретные результаты, то есть основание назвать существующие отношения с Советским Союзом вполне удовлетворительными. Имеются люди, утверждающие, что эти благоприятные обстоятельства носят лишь временный характер и что рано или поздно нам придется считаться с внутриполитическим и внешнеполитическим давлением СССР. Опыт правительства во всяком случае не оправдывает эти предсказания. Правительство считает, что пакт от 5 октября вытекает из интересов обоих государств, особенно если принять во внимание военные условия и то, что пакт заключен при обоюдном доверии и полном уважении к суверенитету обеих сторон».

Министр подробно остановился на латвийско-германском договоре от 30 октября о репатриации граждан немецкой национальности. Он сказал: «Чрезвычайно важным событием был заключенный 30 октября 1939 года договор об эмиграции граждан немецкой национальности. 15 декабря было закончено переселение и почти 45 тысяч человек покинуло нашу страну. Первые месяцы войны открыли нам глаза на большие национальные и социальные повороты, которые характеризуют нынешнюю эпоху. Я должен спросить, какова позиция нашего народа и нашего государства в этой войне, и вызванном ею столкновении сил и идей? Она сводится к основному принципу — обеспечению нашего самостоятельного национального существования. Последние годы, видя скрытое, но возрастающее обострение отношений между великими державами, руководящими судьбами Европы, видя ослабление системы международной безопасности, видя постепенный развал здания международного сотрудничества, мы все больше склоняемся к позиции нейтралитета. Мы хорошо сознаем, что только эта политика оградит наше государство от вмешательства в вооруженную борьбу за чуждое нам дело.

Ни при каких условиях свободный латышский народ не отступит от своей нынешней позиции. Кроме незаменимой силы, которая кроется в единодушии народа, мы можем черпать бодрость в нашей здоровой, национальной и общественной структуре».

(ТАСС).

ЛИТОВСКАЯ ПЕЧАТЬ О ЗАКЛЮЧЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННОГО СОГЛАШЕНИЯ МЕЖДУ ГЕРМАНИЕЙ И СССР

Каунас, 13 февраля. (ТАСС). Сегодня все литовские газеты на видном месте публикуют сообщение о заключении хозяйственного соглашения между Германией и СССР.

Газета «Лиетувос жиниос» по поводу советско-германского соглашения пишет, что подписание нового хозяйственного соглашения между Германией и СССР является большим достижением для обеих сторон.

Газета «XX амжиус» указывает, что советско-германское соглашение предусматривает такой об'ем товарооборота между этими двумя странами, какого не предусматривает ни один из торговых договоров, заключенных когда-либо Германией за все время ее существования.

КІНО

„ЧАЦВЕРТЫ ПЕРЫСКОП“

Наша савецкая кінематаграфія мае ў сваім творчым актыве рад фільмаў аб баявых днях нашага слаўнага марскога флота, — фільмаў аб гераізме, аб непахіснай адданасці чырвонафлотцаў. Сярод гэтых кінофільмаў першыя месцы займаюць вядомыя ўсяму свету фільмы: „Мы з Кранштадта“, „Балтыйцы“ і „Пагібель эскадры“.

На экранах горада зараз дэманструецца новы фільм „Чацверты перыскоп“ (вытворчасць ордэнаноснай Ленінградскай кіностудыі). Гэты фільм таксама паказвае жыццё чырвонага марскога флота. Але гэта ўжо не мінулае флота, а яго баявыя будні, будні поўныя кіпучай энергіі, вучобы, поўнакроўнага жыцця, гераічнай дзейнасці.

У „Чацвертым перыскопе“ ўскрываюцца характары людзей ва ўсёй іх складанасці, паказваецца вялікая адданасць радзіме, перад якой не могуць устаяць нават пачуцці роднасці.

Галоўнымі дзеючымі асобамі фільма з'яўляюцца браты Крайневы. Адзін з іх — камандзір мінаносца „Отважный“, а другі — камандзір падводнай лодкі „Спрут“. На супярэчнасцях гэтых двух братоў, двух розных чалавечых характараў пабудавана асноўная лінія сюжэта. Якасці гэтых розных, але глыбока станоўчых характараў ярка выявіліся ў часе манеўраў эскадры.

... Камандзіры атрымалі баявыя заданні. Караблі вышлі ў мора: эскадра на чале з лінкорам і 4 падводнымі лодкамі. У часе ходу аперацый камандзір эсмінца „Отважный“ В. Крайнеў заўважыў недалёка ад лінкора перыскоп падводнай лодкі. У гэтым месцы савецкая лодка не павінна была быць, але „Спрут“, якім камандаваў другі брат, не паяўляўся, і гэта мог быць выпадкова ён. Камандзір эсмінца пасля доўгіх ваганняў усё-ж аддае загад знішчыць лодку, бо інакш (калі гэта варожая лодка) яна патопіць лінкор. Падводная лодка ідзе на дно. Ад „Спрута“ няма ніякіх звестак. Ствараецца ўражанне, што гэта і быў ён, што брат патапіў савецкую лодку, каманду, брата. Нарэшце, высвятляецца, што „Спрут“ сапраўды быў патоплен варожым замаскіраваным караблём, а замест „Спрута“ да эскадры падышла варожая лодка, якую эсмінец і патапіў.

Мужнасць, адвага і знаходлівасць савецкіх байцоў праяўляецца не толькі ў сапраўдных баях, але і ў звычайнай абстаноўцы. Валявыя якасці выхоўваюцца штодня, і выхаванню гэтых якасцей дапамагае фільм „Чацверты перыскоп“.

Калектыў ордэнаноснай кіностудыі „Ленфільм“, на чале з маладым рэжысёрам Эйсымонт стварыў просты, глыбока праўдзівы, хвалюючы фільм аб суровых буднях нашага флота, аб яго людзях-героях, якія дзень і ноч вартуюць спакой на нашых марскіх рубяжах.

М. Бліцінаў

—«о»—

ПО ГОРОДУ И ОБЛАСТИ

НОВЫЙ БАНК

В Белостоке организуется областная контора промышленного банка СССР.

Основной задачей конторы является финансирование промышленного строительства в Белостокской области.

Контора осуществляет также контроль за правильным использованием средств, представленных руководителями разным организациям на новое строительство и на реконструкцию существующих уже предприятий.

МАГАЗИН НОТ И ИЗОПРОДУКЦИИ

Когизом открыт в Белостоке новый магазин по продаже нот и изопродукции.

Магазином получены много портретов вождей партии и правительства. Имеются плакаты, картины, открытки, панно, гербы союзных республик, грамофонные пластинки с записями речей вождей партии и правительства.

РАБОТНИКИ ИСКУССТВА ГОТОВЯТСЯ К ВЫБОРАМ

Подготовку к выборав в Верховные Советы Союза ССР и БССР работники искусства Белостокской области отмечают огромным творческим под'емом.

Интересную программу на тему о выборах готовит Еврейский театр миниатюр (художественные руководители тт. Джиган и Шумахер).

Областной Дом народного творчества наметил 80 художественных коллективов, которые будут обслуживать собрания избирателей, митинги и встречи кандидатов с избирателями.

Несколько бригад, составленных из высококвалифицированных исполнителей, направляет в районы западных областей Белорусская государственная эстрада.

Адказны радактар
Б. М. Зельманаў

БЯСПРАЎЕ НЕГРАЎ У ЗША

Заканадаўчы сход штата Місісіпі (ЗША) адобрыў законапраект, які прадугледжвае выданне асобных падручнікаў па пытаннях дзяржаўнага ўстройства для дзяцей белых і для негрыцянскіх. У падручніках, прадназначаных для дзяцей неграў, адсутнічае выкладанне правіл і парадку галасавання на выбарах, адсутнічае таксама апісанне „правоў і абавязкаў грамадзян“.

Выступаўшы ў спрэчках па гэтаму пытанню ўладар буйных плантацый Дэйвіс заявіў: „Негры ніколі не могуць спадзявацца на тое, што яны атрымаюць такія-ж прывілеі ў галіне соцыяльнага заканадаўства і асветы, як белыя“.

Неабходна адзначыць, што негры састаўляюць большасць насельніцтва штата Місісіпі. Не гледзячы на гэта, яны пазбаўлены права голасу, а таксама і многіх іншых правоў. Негрыцянскія дзеці наведваюць школы, дзе яны атрымоўваюць значна менш ведаў, чым дзеці белых у сваіх школах.

(ТАСС).

ЯПОНСКИЕ ПОТЕРИ В ШАНЬСИ

Чунцин, 14 февраля. (ТАСС). Газета «Дагунбао» сообщает, что за два с половиной года войны японские потери в провинции Шаньси достигают 300 тысяч человек.

Белостокский Горком КП(б)Б с глубоким прискорбием извещает о безвременной смерти члена КП(б)Б, секретаря первичной партийной организации электростанции,

тов. **СТРАДЗЕ Ю. П.**

и выражает свое соболезнование семье покойного.

Коллектив сотрудников редакции газеты „Вольная Праца“ выражает соболезнование заместителю ответственного редактора **Броне Фрейндорф** по поводу безвременной смерти ее горячо любимого мужа

тов. **СТРАДЗЕ Ю. П.**

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 165.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.